Запрашальнік

Пад гітару, каля вогнішча і з бутэрбродамі ад Барыса Бурды

Дзясятае музычна-спартыўнае свята «Вялікая бард-рыбалка» чакае гасцей

Фестываль пройдзе ў апошнія выхадныя ліпеня на Магілёўшчыне, на беразе Чыгірынскага вадасховішча ў пасёлку Грудзічына Быхаўскага раёна. Удзельнікамі яго стануць выканаўцы з розных краін свету: Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Літвы, Эстоніі, Іспаніі, таксама, паводле слоў арт-дырэктара «Вялікай бард-рыбалкі» Вольгі Залескай, чакаюцца музыканты з ЗША.

«Вялікая бард-рыбалка» адбываецца штогод, пачынаючы з 2010-га, і паступова вырасла з міжрэгіянальнага творча-спартыўнага форуму да міжнароднага. Як падлічылі арганізатары, за ўсе гады правядзення тут выступілі аўтары-выканаўцы і калектывы з 14 краін свету, а паслухала і паглядзела канцэрты звыш 15 тысяч гасцей.

У праграме фэсту 2019 года — сольныя канцэрты і творчыя праекты папулярных выканаўцаў аўтарскай песні, джазавых і інструментальных ансамбляў, выступленне лаўрэатаў і пераможцаў розных гадоў конкурсу «З песняй па жыцці», конкурс «Гітара па крузе», а таксама ўжо традыцыйныя спаборніцтвы па спартыўнай рыбнай лоўлі, лазнева-аздараўленчая праграма, адкрыты турнір па пляжным валейболе, танцавальны марафон, конкурс «Каралева бард-рыбалкі» з майстрам беларускага фітнес-руху Наталляй Наважылавай, кубак па бегу і іншыя мерапрыемствы. Сярод навінак — музычная пляцоўка «Адэскі дворык», брэйн-рынг, кулінарныя шоу, майстар-класы і конкурсы пад кіраўніцтвам барда, пісьменніка, інтэлектуала і тэлевядучага Барыса Бурды. У адным з кулінарных спаборніцтваў, напрыклад, удзельнікам трэба будзе «сканструяваць» бутэрброд — з прадуктаў кампаній-партнёраў, а таксама з уласных, прычым фантазію і колькасць інгрэдыентаў ніхто не абмяжоўвае, але трэба ўкласціся ў час: 20 хвілін.

Квіткі на «Вялікую бард-рыбалку» коштам у 20 рублёў можна будзе набыць непасрэдна на месцы правядзення фестывалю. Акрамя таго, ахвотныя могуць загадзя арандаваць месца ў палатачным гарадку, паставіць сваю палатку на спецыяльна адведзеных пляцоўках альбо размясціцца ў навакольных аграсядзібах. Падрабязней з праграмай фэсту, картай праезду і ўмовамі рэгістрацыі і размяшчэння можна азнаёміцца на сайце мерапрыемства http://bard-rybalka.by.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 72

Сваю новую задачу прапануе чытачам Міхаіл Кошаль з Мінска ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крb1, Фс1, Ла3, Сd4, Ке7 (5)

Чорныя: Кре4, Лh4, Сg1, пg4 (4).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Як мы ўжо паведамлялі, завяршыліся сёлетнія чэмпіянаты Беларусі па шахматах. У мужчын змагаліся чатыры гросмайстры, тры міжнародныя майстры і тры майстры ФІДЭ. Адсутнічаў адзін з наймацнейшых беларускіх шахматыстаў Уладзіслаў Кавалёў. А перамог гросмайстар Аляксей Аляксандраў (чэмпіёнам ён стаў шосты раз, прычым двойчы запар у апошнія два гады). На другім месцы — гросмайстар Кірыл Ступак, на трэцім — міжнародны майстар Міхаіл Нікіценка. У турніры змагаліся два зусім яшчэ маладыя шахматысты: 12-гадовы Арцём Стрыбук з дзевяці партый восем прайграў пры адной нічыёй, а вось 13-гадовы Дзяніс Лазавік заняў шостае месца, набраўшы 50 % магчымых ачкоў.

Вось адна з вырашальных перамог чэмпіёна.

Аляксей Аляксандраў — Міхаіл Нікіценка. 1. c4 e5 2. Кс3 Кf6 3. Кf3 Кс6 4. e4 Сb4 5. d3 d6 6. a3 Са5 7. h3 h6 8. g3 Се6 9. Сg2 Кh7 10. b4 Сb6 11. Ка4 Кg5 12. К:b6 К:f3+ 13. Ф:f3 ab 14. Сb2 Кd4 15. С:d4 ed 16. e5 Ла7 17. 0-0 de 18. Фh5 Фg5 19. Фе2 0-0 20. h4 Фf6 21. f4 Фg6 22. Крh2 Сg4 23. Фd2 Сf5 24. fe С:d3 25. Лf4 с5 26. Сd5 Сf5 27. g4 С:g4 28. Фg2 Сh5 29. Фf2 Лаа8 30. Лg1 Фd3 31. е6 Фе2 32. Ф:е2 С:е2 33. е7 d3 34. efФ+ Л:f8 35. Сf3 Ле8 36. С:е2 Л:е2+ 37. Крg3 Ла2 38. Крf3 Л:а3 39. b5, 1:0.

У жанчын барацьбу вялі тры гросмайстры, адзін міжнародны майстар і два майстры ФІДЭ. Чэмпіянат сенсацыйна выйграла 12-гадовая Аляксандра Тарасенка, сямікласніца з Брэста (трэнер Уладзіслаў Каташук). Перад тым яна гэтак жа нечакана стала чэмпіёнкай краіны да 20 гадоў, а цяпер атрымала запар сем перамог, нічыёй у восьмым туры забяспечыла сабе чэмпіёнскі тытул і толькі ў апошнім туры адну партыю прайграла. На другім месцы — майстар ФІДЭ Наталля Кусянкова, на трэцім — гросмайстар Генрыета Лагвілава.

Прапануем дзве пераможныя партыі новай чэмпіёнкі.

Аляксандра Тарасенка — Яна Ільючык. 1. d4 Кf6 2. Кс3 g6 3. e4 d6 4. Сg5 Сg7 5. e5 Кfd7 6. f4 h6 7. Сh4 g5 8. Сf2 de 9. fe Кf8 10. Сс4 Се6 11. d5 Сf5 12. Фf3 Сg6 13. е6 Фс8 14. 0-0-0 Кh7 15. h4 h5 16. g4 Кf6 17. hg К:g4 18. Сg3 Ке5 19. Фе2 К:с4 20. Ф:с4 Ка6 21. Кf3 с6 22. Се5 С:е5 23. К:е5 cd 24. ef+ С:f7 25. Фа4+ Крf8 26. Лhf1, 1:0.

Аляксандра Тарасенка — Рахіль Эйдэльсон. 1. f4 d6 2. g3 g6 3. Сg2 Сg7 4. d3 e5 5. Кс3 ef 6. С:f4 Кс6 7. Кf3 Кf6 8. 0-0 h6 9. e4 Сg4 10. h3 Се6 11. d4 d5 12. ed К:d5 13. К:d5 С:d5 14. Фе2+ Фе7 15. Ф:е7+ Кр:е7 16. Лае1+ Крd8 17. Ке5 С:g2 18. К:f7+ Крd7 19. Кр:g2 Лhе8 20. Ке5+ К:е5 21. С:е5 С:е5 22. Л:е5 Л:е5 23. de Ле8 24. Лf7+ Крd8 25. Лf6 Л:е5 26. Крf3 Лb5 27. b3 Лb6 28. Л:b6 ab 29. Кре4 Кре7 30. Кре5 Крf7 31. а4 Кре7 32. b4 Крf7 33. с4 Кре7 34. а5 ba 35. ba Крd7 36. Крf6 Крd6 37. Кр:g6 Крс5 38. Кр:h6 Кр:с4 39. g4 Крd5, 1:0.

* * *

Кірыл Ступак на турніры ў Сочы (52 удзельнікі) падзяліў 1—2-е месцы з украінскім гросмайстрам Станіславам Багдановічам і перамог яго ў дадатковым матчы з дзвюх партый. Аляксей Аляксандраў падзяліў тут 3—5-е месцы. Аляксей Фёдараў падзяліў 5—6-е месцы на Мемарыяле Чабаненкі ў сталіцы Малдовы. У Гродне на Мемарыяле Дабкуса ў прызавую тройку ўвайшлі: у рапідзе — Уладзімір Верамейчык, Андрэй Малюш і Андрэй Альховік, у бліцы — Андрэй Кавалёў, Уладзімір Верамейчык і Андрэй Альховік.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Фс5! Першымі правільна адказалі Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

ТРЫ НАГОДЫ ЎКЛЮЧЫЦЬ ТЭЛЕВІЗАР

ФЕСТЫВАЛЬ

Калі ўбачыць «Славянскі базар у Віцебску» хочацца, а выбрацца ў Віцебск на наступным тыдні ніяк не атрымліваецца, засмучацца не варта. Значную частку фестывальных канцэртаў пакажуць тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі.

Так, цырымонію адкрыцця міжнароднага форуму мастацтваў 11 ліпеня пакажуць «Беларусь 1» і «Беларусь 24», не ўпускаючы ніводнага ўдзельніка — ад аксакалаў эстрады Валерыя Лявонцьева і гурта «Сябры» да сучасных трукачоў інструменталістаў, хору Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра, артыстаў балета Людмілы Уланцавай і Эвена Капітэна, завадных барабаншчыкаў са школы Raccoon Batucada і спецыяльных гасцей з Італіі, ЗША, Швецыі, Малдовы, Украіны, Чэхіі і Казахстана.

12 ліпеня ў прамой трансляцыі будзе паказаны канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...», прысвечаны 50-годдзю легендарнага ансамбля «Песняры» і 20-годдзю ўласна Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

10—12 ліпеня «Беларусь 3» пакажа дзіцячы міжнародны конкурс «Віцебск-2019», ад першага выступлення да ўзнагароджання пераможцаў, а 13 і 14 ліпеня ў прамым эфіры выступяць удзельнікі конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2019» са славянскімі і сусветнымі хітамі — першыя прагучаць пад аркестр пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга, другія — пад фанаграму «мінус 1». Нарэшце ўрачыстую цырымонію закрыцця тэлегледачы ўбачаць адначасова з публікай у Летнім амфітэатры 15 ліпеня — таксама на «Беларусь 1» і «Беларусь 24».

Акрамя таго, ужо з 8 ліпеня на «Беларусь 1» будуць выходзіць штодзённыя «Базарныя гісторыі» — квінтэсэнцыя культурных навін і ўражанняў. А пазней у эфір каналаў медыяхолдынга выйдуць канцэрты «Залаты хіт», «Шансон-ТБ — усе зоркі», праграма Ірыны Дарафеевай «Акрыляй» і Прэзідэнцкага аркестра Беларусі «Уверцюра да фестывалю: ад класікі да рока» і іншыя, якія запіша Генеральны прадзюсарскі цэнтр Белтэлерадыёкампаніі.

ЮБІЛЕЙ

Да 70-годдзя вядомага савецкага і расійскага кінарэжысёра Паўла Лунгіна, якое здарыцца 12 ліпеня, тэлеканал «Культура» парадуе гледачоў падборкай фільмаў майстра.

У гэтым спісе, натуральна, не ўсе чатыры дзясяткі карцін, знятых рэжысёрам, а толькі маленькая частка, нібыта зрэз творчасці Лунгіна розных гадоў: «Таксі-блюз» (1990), з якім майстар атрымаў прыз Канскага фестывалю за найлепшую рэжысуру, «Вяселле» (2000), «Востраў» (2006), які прынёс Лунгіну некалькі прэстыжных расійскіх кінапрэмій, «Цар» (2009), «Дырыжор» (2012), а таксама дакументальная стужка «Маналогі кінарэжысёра». У апошняй рэжысёр, сцэнарыст, акцёр і прадзюсар распавядае не толькі пра атрыманыя ўзнагароды і ганаровыя званні, але пра творчыя і жыццёвыя прынцыпы і паказ у кожнай карціне «прачынання душы» чалавека...

СПРАВЕ ЧАС

Як знайсці падпрацоўку на адзін дзень — калі вы раптоўна трапілі пад скарачэнне, альбо тэрмінова патрэбныя грошы, альбо часова не маеце магчымасці працаваць пастаянна? Адказ на гэта пытанне шукаюць і, што характэрна, знаходзяць стваральнікі праграмы «Паляванне на работу», якая выходзіць на канале «МІР».



Масажыст, фотамадэль і фатограф, работнік сферы грамадскага харчавання... Кожны тыдзень па нядзелях вядучыя на ўласным вопыце пераконваюцца, у чым плюсы і мінусы розных відаў разавых падпрацовак, на якія падводныя камяні можна наступіць па няведанні, і на якую суму заробку можна разлічваць пры свабодным рабочым графіку. «Зарабляем лёгка і з радасцю!» — заклікаюць тэлевізійнікі. Наколькі гэта атрымліваецца — глядзіце самі.